Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 22 (367) | Пятніца, 29 мая 1959 года | Цана 20 кап.

## НЕКАЛЬКІ ВЫВАДАЎ З ВОПЫТУ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

У гэтым навучальным годзе рэктарат, дэканаты і кафедры правялі вялікую работу па перабудове вучэбнай работы ва універсітэце ў адпаведнасці з Законам аб перабудове вышэйшай школы. На якасці вучэбна-выхаваўчай работы дадатна сказаліся перагляд вучэбных графікаў і праграм, устараненне дубліравання ў выкладанні, узмацненне самастойнай работы студэнтаў.

Аднак перабудову вучэбнай работы нельга лічыць закончанай. Выкарыстаны далёка не ўсе магчымасці скарачэння часу абавязковых заняткаў у аўдыторыях. На некаторых факультэтах (гістфак, філфак) не ліквідаваны яшчэ паралелізм у выкладанні асобных раздзелаў навук.

Кантроль за самастойнай работай студэнтаў быў у гэтым навучальным годзе недастатковым. Невыпадкова, што каля 10 працэнтаў студэнтаў універсітэта ў час зімовай экзаменацыйнай сесіі атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

На некаторых факультэтах вялікая колькасць студэнтаў (Булгакава, Тузін) не здала ў тэрмін на кафедры курсавыя і дыпломныя работы.

Некаторыя выкладчыкі недастаткова працуюць над павышэннем свайго педагагічнага майстэрства.

Усё гэта гаворыць аб тым, што нам трэба павышаць узровень крытыкі пры абмеркаванні наведваемых лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў, глыбей аналізаваць прычыны недахопаў, якія сустракаюцца ў працэсе навучання, быць больш патрабавальным да маладых выкладчыкаў.

Вялікага клопату патрабуе падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў. Ва універсітэце ёсць шмат выкладчыкаў, якія не маюць вучоных ступеняў і званняў. Важнай задачай дэканатаў, кафедраў, вучоных саветаў з'яўляецца больш правільнае выкарыстанне конкурсаў з мэтай прыцягнення новых дацэнтаў і прафесараў для работы ва універсітэце, а таксама разнабаковая дапамога тым навуковым работнікам, якія заканчваюць работы па напісанню кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Далейшага ўдасканалення патрабуе выхаваўчая работа ва універсітэце. Навуковыя работнікі ў гэтым навучальным годзе сталі часцей выступаць перад студэнтамі з дакладамі і лекцыямі, часцей бываць у студэнцкіх інтэрнатах. Але дысцыпліна студэнтаў усё ж яшчэ нізкая. Амаральныя паводзіны асобных нашых студэнтаў (Крылоў, Арцюшын, Гілевіч, Кіслякоў) гавораць аб тым, што наш універсітэт працягвае выпускаць і такіх спецыялістаў, якія наўрад ці змогуць стаць добрымі выхавацелямі падрастаючага пакалення.

У наступным навучальным годзе пытанне аб паляпшэнні дысцыпліны павінна стаць прадметам асаблівай увагі партыйнай і камсамольскай арганізацый, дэканатаў і кафедраў нашага універсітэта.

## ПРЫЁМ ПАЧАЎСЯ

Пачаўся прыём на завочны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У гэтым годзе колькасць завочнікаў у параўнанні з мінулымі значна павялічыцца. Ужо зараз пададзены першыя заявы. Сярод абітурыентаў— рабочыя, калгаснікі, дэмабілізаваныя воіны, настаўнікі, служачыя, савецкія і партыйныя работнікі.



Рыхтуюцца...

Мал. П. ДАВІДЗЕНКІ.

## ПОСПЕХІ САВЕЦКІХ МАТЭМАТЫКАЎ

Нядаўна, вярнуўшыся з Масквы, дзе на працягу 6 дзён праходзіў Усесаюзны калоквіум па алгебры, прафесар Дзімітры Аляксеевіч Супруненка прачытаў для студэнтаў і супрацоўнікаў матэматычнага факультэта лекцыю аб дзвюх буйнейшых падзеях у матэматычным жыцці краіны.

Першая з іх—гэта прысуджэнне Ленінскай прэміі выдатнаму савецкаму алгебраісту члену-карэспандэнту АН СССР Ігару Расціслававічу Шафарэвічу за яго работы «Общий закон взаимности» і «Решение обратной задачи Галуа для разрешимых групп».

Праблемы, так бліскуча вырашаныя Ігарам Расціслававічам, узніклі яшчэ ў нетрах класічнай матэматыкі. Каля двух сот гадоў назад Эйлер эмпірычна ўстанавіў адну ўласцівасць у паводзінах пар простых лікаў, названую ім законам узаемнасці квадратычных вычатаў. Прайшоўшы праз працы Лежандра, свой першы доказ закон квадратычных вычатаў атрымаў толькі ў Гаўса. (Цікава, што ў цяперашні час ёсць каля 50 розных доказаў, прычым 8 з іх—Гаўса).

Калі матэматыка, у сілу свайго развіцця, перайшла да разгляду больш агульных, чым сістэма цэлых лікаў, алгебраічных сукупнасцяў—палёў, паўстала пытанне аб перанясенні некаторых уласцівасцяў цэлых лікаў, у тым ліку і закона ўзаемнасці (праўда, у абагуленым выглядзе) на гэтыя больш агульныя сукупнасці. Але калі пры ўсякай абстракцыі даводзіцца чымсьці ахвяраваць, то тут давялося адмовіцца ад таго, што займала цэнтральнае месца і надавала такую прыгажосць і стройнасць усёй тэорыі ліку—ад тэарэмы адзінасці прадстаўлення цэлага ліку ў выглядзе здабытку простых множнікаў. Аказалася, што ў адвольных палях іх элементы не адназначна разлагаюцца ў здабытак натуральна ўведзеных простых множнікаў. Гэта выклікала неабходнасць зноўку пабудаваць усю арыфметыку палёў і сур'ёзна ўскладніла доказ агульнага закона ўзаемнасці. І калі закон узаемнасці квадратычных вычатаў патрабаваў для свайго рашэння каля 40 гадоў, дык агульны закон узаемнасці, нягледзячы на намаганні такіх першакласных матэматыкаў як Кумер, Дзедэкінд, Арцын, Гільберт, Чабатароў, быў поўнасцю даказаны толькі праз 100 гадоў І. Р. Шафарэвічам.

Другая векавая праблема, якая таксама знайшла сваё завяршэнне ў працах Ігара Расціслававіча, звязана з імем геніяльнага французскага матэматыка 30-ых гадоў мінулага стагоддзя Эварыста Галуа, які за сваё кароткае і трагічнае жыццё (Галуа быў забіты ва ўзросце 21 года на дуэлі, справакаваным урадавымі агентамі) сумеў, дзякуючы сваім працам па тэорыі алгебраічных ураўненняў, узбагаціць матэматыку шэрагам вельмі жыватворных ідэй.

Яшчэ старажытнымі грэкамі было ўстаноўлена існаванне такога алгебраічнага выразу, якое пры падстаноўцы ў яго каэфіцыентаў квадратнага ўраўнення давала б яго корані. Аналагічны факт для ўраўненняў 3 і 4 ступені быў, аднак, устаноўлены толькі ў час італьянскага Адраджэння. Тады ж было выказана меркаванне, што ён мае месца для ўраўнення любой ступені. Але ішлі стагоддзі, а доказу таму не было. І ўраз зусім нечакана, у пачатку XIX стагоддзя нарвежац Абель (лёс якога ў многім падобны да лёсу Галуа) паказаў, што, пачынаючы з ураўненняў 5 ступені і вышэй, не існуе такога выразу, які б даваў корані любога ўраўнення гэтай ступені або, як гэта прынята гаварыць, ураўненне не рашаецца ў радыкалах. Але калі для усіх ураўненняў n-й ступені немагчыма рашэнне ў радыкалах, то можа быць яно мае месца для якіх-небудзь класаў гэтых ураўненняў?

Даследванне гэтага пытання і праславіла імя Галуа. Выкарыстаўшы заўважаную раней Лагранжам сувязь паміж уласцівасцямі сіметрыі кораняў алгебраічнага ўраўнення і магчымасцю рашэння ўраўнення ў радыкалах і распрацаваўшы для гэтага тэорыю груп падстановак кораняў алгебраічнага ўраўнення, ідэі якой аказалі вялікі ўплыў на ўсё далейшае развіццё матэматыкі і знайшлі сваё бліскучае прымяненне ў сучаснай тэарэтычнай фізіцы, Галуа знайшоў умовы рашаемасці ўраўнення ў радыкалах.

Аказалася, што з кожным ураўненнем можна звязаць групу падстановак яго кораняў—групу Галуа гэтага ўраўнення, асобыя ўласцівасці якой і даюць адказ на пастаўленае пытанне.

Натуральна, што пры гэтым узніклі наступныя праблемы:

1) як па заданаму ўраўненню наглядна пабудаваць яго групу Галуа,

2) і, наадварот, ці можна па загадзя заданай групе спецыяльнага тыпу пабудаваць ураўненне, для якога гэта група будзе групай Галуа.

Апошняя праблема, што атрымала назву адваротнай задачы Галуа, і была з поспехам разгледжана І. Р. Шафарэвічам. Ён знайшоў спосабы пабудовы ўраўненняў з рацыянальнымі каэфіцыентамі, якія маюць сваёй групай Галуа любую наперад зададзеную вырашальную групу. Гэтым былі завершаны больш чым стагадовыя намаганні алгебраістаў усяго свету.

(Заканчэнне на стар. 2).



НА ЗДЫМКУ: доктар геаграфічных навук А. Н. Андрушчанка прымае экзамен у студэнтаў першага курса геафака.
Фота А. ШРУБКА.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ПАСЛЯ ПАРТЫЙНАГА СХОДУ

...Даклад падыходзіў да канца, а прысутнічаючыя на адкрытым партыйным сходзе работнікі геаграфічнага факультэта, так і не маглі зразумець, за што ж кафедра эканамічнай геаграфіі і яе загадчык дацэнт Н. Я. Рагозін былі падвергнуты сур'ёзнай крытыцы на агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе. Ні ў самым дакладзе, ні ў заключэнні тав. Рагозін не даў аб'ектыўнага аналізу работы кафедры. Уся аргументацыя дакладчыка зводзілася да таго, каб паказаць толькі дадатныя бакі ў рабоце кафедры.

—Члены кафедры працавалі добра... Імі надрукаваны шэраг навуковых прац... На пасяджэннях разгледжана 45 пытанняў... У вучэбным працэсе выкарыстоўвалі наглядныя дапаможнікі, дэманстраваліся кінафільмы і г. д.

Гаворачы аб недахопах работы кафедры, дакладчык абмежаваўся толькі некалькімі заўвагамі агульнага характару.

Іншыя пазіцыі занялі члены гэтай кафедры. Як і ўся партыйная арганізацыя факультэта яны правільна, па-партыйнаму ўспрынялі крытыку на агульнауніверсітэцкім сходзе ў адрас кафедры эканамічнай геаграфіі і ў сваіх выступленнях самакрытычна падыйшлі да абмяркоўваемага пытання. Пасля выступлення сакратара партбюро тав. І. І. Трухана, дацэнта М. Т. Раманоўскага, дэкана факультэта А. Н. Андрушчанкі і другіх стала ясна, што на кафедры эканамічнай геаграфіі далёка не ўсё ў парадку. Кафедра дрэнна ўкамплектавана штатнымі работнікамі. У яе складзе няма прафесараў і дактароў навук. З 8 адзінак штатнымі работнікамі занята толькі 5. Загадчык кафедрай дацэнт М. Я. Рагозін мала праяўляе ініцыятывы і энергіі ў камплектаванні кафедры высокакваліфікаванымі спецыялістамі-географамі. Ён мала раіцца з членамі кафедры. Па гэтай прычыне на кафедру быў запрошаны малакваліфікаваны спецыяліст Ніканораў.

На кафедры слаба пастаўлены кантроль за якасцю выкладання. За вучэбны год былі абмяркаваны вынікі наведвання лекцый толькі тав. А. С. Акінчыца і Б. Я. Сіроты і сценаграм лекцый М. Раманоўскага. Тав. Рагозін ні разу не быў на занятках у членаў кафедры Раманоўскага, Трухана І. І., М. М. Іпа, Л. М. Сосіна і іншых. Ніхто з членаў кафедры не прысутнічаў на занятках у загадчыка кафедрай тав. Н. Я. Рагозіна. Пры наведванні лекцый тав. Н. Я. Рагозін, як правіла, імкнецца толькі расхвальваць лектара, замест дзелавога разбору іх зместу і методыкі. Гэта не садзейнічае разгортванню здаровай крытыкі і самакрытыкі на кафедры, вядзе да зніжэння патрабавання, а значыць, і якасці выкладання. Не выпадкова на працягу шэрагу гадоў тав. А. С. Акінчыц слаба аналізуе матэрыял, дыктуе студэнтам лекцыі, штучна расцягвае іх; тав. Шкляева пры чытанні курса асноў сельскагаспадарчай вытворчасці не ўвязвае вывучаемы матэрыял з геаграфіяй і г. д. Нельга згадзіцца і з тым, калі замест лекцыі і практычных заняткаў дэманструюцца двухгадзінныя навукова-папулярныя кінафільмы, часта не звязаныя непасрэдна з тэмай.

У стылі работы кафедры многа фармалізма. Іначай і нельга назваць практыку, пры якой абарона справаздач студэнтамі 4 курса зацягнулася да зімовай экзаменацыйнай сесіі, а курсавых работ праводзілася нават у час вясновай сесіі. Загадчык кафедрай тав Рагозін правёў абарону курсавых работ 18 мая, а адзнакі па ім здаў у дэканат за некалькі дзён да абароны. Так зрабіць ён рэкамендаваў і другім членам кафедры.

У бягучым годзе на кафедры выдана шэраг навуковых работ. Але ў цэлым план навукова-даследчай работы за 1958 год кафедра не выканала. Прычым сумяшчальнікі зусім не ўдзельнічалі ў навукова-даследчай рабоце. На кафедры дрэнна плануецца вучэбная нагрузка. У другім семестры т. т. Рагозін і Акінчыц зусім не маюць нагрузкі на факультэце.

Значным упушчэннем у рабоце кафедры з'яўляецца і тое, што на абмяркаванне не выносяцца тэарэтычныя пытанні эканамічнай геаграфіі, методыка правядзення лекцый і практычных заняткаў. Не заслухоўваліся таксама справаздачы выкладчыка аб вучэбнай і выхаваўчай рабоце ў студэнцкіх групах.

Партыйны сход зрабіў папрок і і ў адрас дэкана факультэта і сакратага партбюро, якія не праяўлялі патрабавальнасці да работнікаў кафедры і своечасова не прынялі дзейсных мер для павышэння яе ролі ў вучэбна-выхаваўчай і навукова—даследчай рабоце на факультэце.

Партыйны сход прыняў разгорнутае рашэнне па абмяркоўваемым пытанню, у якім прадугледжаны канкрэтныя меры па ліквідацыі недахопаў, якія маюцца на кафедры. Можна спадзявацца, што гэты партыйны сход паслужыць сур'ёзным урокам для загадчыка кафедрай тав. Рагозіна і ўсіх членаў гэтай кафедры і прынясе сваю карысць у паляпшэнні работы калектыву.



## АГЛЯД САМАДЗЕЙНАСЦІ

**Закончыўся агляд мастацкай самадзейнасці факультэтаў. У ім удзельнічала каля 500 студэнтаў. Агляд выявіў шмат новых талентаў—спевакоў, танцораў, дэкламатараў. Заключаны канцэрт паказаў, што універсітэцкая самадзейнасць расце і мацнее.**

**Першае месца заваяваў калектыў юрыдычнага факультэта, які добра падрыхтаваўся да агляду. Другое месца заняў філалагічны факультэт. Калектыў гістарычнага факультэта заваяваў трэцяе месца. Значна ніжэй сваіх магчымасцей выступілі калектывы біялагічнага і фізічнага факультэтаў.**

**Пераможцы агляду ўзнагароджаны Граматамі рэктарата.**

# *ПОСПЕХ САВЕЦКІХ МАТЭМАТЫКАЎ*

**(Заканчэнне. Пачатак на 1 стр.)**

Другой вялікай падзеяй, так радуючай савецкіх матэматыкаў, з'яўляецца рашэнне праблемы Бернсайда, атрыманае выдатным савецкім матэматыкам членам-карэспандэнтам АН СССР Пятром Сяргеявічам Новікавым.

Праблема англійскага матэматыка Бернсайда таксама «з барадой»—яе ўзрост налічвае каля 60 гадоў. Пастаўлена яна была ў агульнай тэорыі груп, развітай з ідэй Галуа. Яе фармуліроўка такая: «Калі група задана канечным лікам утвараючых канечнага парадку, то ці будзе яе парадак канечным або не?» Доўгі час лічылася, што адказ на гэта пытанне будзе дадатным, але прамых доказаў ніхто даць не мог.

Пры гэтым праблема Бернсайда ўяўляе сабой адно з тых вузлавых пытанняў, ад якога залежыць не толькі рашэнне існуючых, але і пастаноўка новых задач усёй тэорыі груп. Таму справа дайшла да таго, што на апошнім матэматычным кангрэсе ў Эдзінбургу частка алгебраістаў заявіла аб неабходнасці атрымання дадатнага (у чым яны не сумняваліся) доказу праблемы Бернсайда, акцэнтуючы ў той жа час усю яе цяжкасць.

А ў красавіку гэтага года ў сваім дакладзе на Усесаюзным алгебраічным калоквіуме П. С. Новікаў паведаміў аб знойдзеным ім рашэнні праблемы Бернсайда. Аказалася, што існуе вялікі клас груп, якія пры пастаўленых умовах з'яўляюцца бясконцымі. Вельмі складаны доказ быў праведзены распрацаванымі Пятром Сяргеевічам метадамі матэматычнай логікі, за якія ён раней быў удастоены Ленінскай прэміі.

Паведамленне Д. А. Супруненкі выклікала жывы інтарэс прысутных.

**А. БАРТМАН.**



**НА ЗДЫМКУ: адзін з лепшых шафёраў універсітэта Міхась Кац.**
**Фота А. ШРУБКА.**

*НА КОНКУРС*

# ТУТ НАРАДЖАЮЦЦА ПЕСНІ

**РЭПАРТАЖ**

**НЕЙКІ ДЗІВАК пусціў у ход два вершаваныя радкі: «філалагічны факультэт, куды ні глянь,—то там паэт». Дыму без агню не бывае. Магчыма і ў гэтых радках ёсць доля праўды? Ёсць, безумоўна.**

**Філалагічны факультэт універсітэта здаўна славіцца сваімі добрымі традыцыямі—падрыхтоўкай кадраў беларускіх літаратуразнаўцаў. Жыве гэта традыцыя і цяпер. І зусім няпраўда, што «прапаў філалагічны факультэт». Тут вучыцца і плённа працуе цэлая кагорта маладых празаікаў, паэтаў. Зусім нядаўна сябры па інтэрнату па Бабруйскай вуліцы віншавалі пяцікурсніка беларускага аддзялення Рыгора Барадуліна з прыняццем яго ў члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. Студэнт-пісьменнік! Гэтай вясной на кніжных паліцах з'явіцца першы зборнік яго вершаў «Маладзік над стэпам». Што ж, няхай свеціць, дужэе маладзік, разгараецца да самага поўня.**

**Рыгор Барадулін жыве ў 54-ым пакоі корпуса «А». Гэты пакой не без падстаў называюць «літаратурным штабам». Жывуць тут яшчэ Барыс Сачанка, Іван Сіпакоў, Іван Пехцераў.**

**Сёння ў гэтым такоі ажыўлена.**

**Кіпіць дыскусія. Хоць цеснавата (прышлі Генадзь Бураўкін, Сямён Блатун. Уладзімір Карызна, Міхась Жук),але думам, пачуццям, словам—вольна. У кожным вершы нешта сваё, адметнае ад другіх. Чытае хлопец верш пра дом, і ўяўляеш, бачыш, адчуваеш абшары Радзімы.**

**— Чытай, Генка, твая чарга,—кажа Барыс Сачанка Генадзю Бураўкіну. І той чытае.**

**Я часам сам сябе не пазнаю:**
**Разважлівы, спакойны і цвярозы,**
**Праз маладосць бясхмарную маю**
**Усё часцей ка мне прыходзіць роздум.**

**Бураўкін чытае ціха, але з сур'ёзнасцю, удумлівасцю. Хлопцы затаілі дыханне і слухаюць. Так, сапраўды бяруць за душу.**

**А Генадзь працягвае:**

**...І з кожным днём вярней мне дружбакі,**
**І ўсё цвярдзей любоў, надзея, вера.**
**Ці то характар робіцца такі,**
**Ці гэта сталасць стукаецца ў дзверы?**

**Мабыць, усё разам. Ці да аднаго яго «стукаецца сталасць». У наступным годзе выдадуць свае першыя кніжкі Бураўкін, Сачанка, Сіпакоў і другія хлопцы-равеснікі. Равеснікі таму, што пачалі яны свой творчы шлях амаль разам, хоць творчая сталасць прыходзіць і прыдзе, мабыць, не ў адзін час. Ды гэта ўвогуле не справа, там пабачым.**

**За вокнамі звіняць трамваі, свішчуць паравозныя гудкі, зелянее ў скверах маладая траўка. Вясна прышла. Хто не любіць яе, гэтую пару года, вясну-вяснянку. І хто аб ёй не пісаў вершаў.**

**У дзверы пастукалі.**

**— О, ды тут, бачу я, цэлая нарада,—жартуе, уваходзячы, Юрась Свірко.**

**— Не хапае ліўняў,—адказвае хтосьці яму ў адказ.**

**Справа ў тым, што ў Юрася таксама хутка, як і ў Бураўкіна, выходзіць першы зборнік «Шэпчуцца ліўні». Многа вершаў сваіх сяброў ведае кожны, і таму не дзіва, што Міхасць Жук не вытрымаў, пачаў чытаць верш Свірко:**

**Зорак, як зерня ў небе высокім**
**Насыпана ў жніўні.**
**Чутна, як недзе далёка-далёка**
**Шэпчуцца ліўні...**

**Адразу ж пасля кожнага чытання пачынаецца гарачае абмеркаванне твора, выяўляюцца хібы, даюцца парады. І вельмі карысна паслухаць гэтыя спрэчкі Ніне Лагун, Уладзіміру Рагойшы, Ігару Хадановічу, Уладзіміру Галайшу, Івану Абабурку, Леаніду Фадзееву і многім іншым, хто заходзіць у гэты пакой паслухаць сваіх таварышаў, у пакой, дзе нараджаюцца песні. Так, песні.**

**Уладзімір Карызна ў дадатак да вершаў складае яшчэ і музыку.**

**І няхай не заўсёды прыходзіць жаданы поспех да маладых літаратараў, але хочацца верыць, што ён прыдзе, бо вераць у гэта і самі хлопцы.**

**А. ДВАЙНОЎ.**



НА ЗДЫМКУ: вучні 42-й школы г. Мінска ў апошні дзень заняткаў. Фота А. Шрубка.

## ПОСЛЕДНИЙ ШКОЛЬНЫЙ БАЛ

Сейчас далёким кажется тот вечер,
Последний школьный бал.
Когда выпускники рассвету шли навстречу,
И каждый это счастьем называл.
Дышали улицы предутренней прохладой.
Шаги так хорошо слышны!
И каждый пел, мечтал, летел куда-то
Среди прозрачной ранней тишины.
А звуки все сильней в покой домов вплетались.
День быстро безудержно рос.
Трава сверкала. В парках распускались
Бутоны свежих, ароматных роз...
А вы стояли там, где все знакомо,
Где бой курантов мелодичен, чист...
Где так торжественно... Нет, снимок для альбома
Не смог минуты те перенести на лист.

Е. КРУТИКОВ.

## Не траціць часу

ДЛЯ МНОГІХ студэнтаў матэматычнага факультэта сёлетняя вясна з'явілася нечаканай. Зялёная траўка, блакітнае неба адмоўна падзейнічалі на першакурсніка Л. Флакса, які надоўга развітаўся з універсітэтам. Студэнтка таго ж курса Л. Несцерава адной нагой таксама стаіць за парогам універсітэта. Гэтыя студэнты засталіся даўжнікамі па двух-трох прадметах.

Не пазбеглі пагубнага ўплыву вясны і першакурснікі Р. Манько і А. Шаліма, студэнты II курса Н. Рудзяк, П. Чарнаморды, чацвёртакурснікі А. Бабарыка і В. Далідовіч. Іх мала турбуе, што да сесіі засталося ўсяго пару дзён.

Спасылкі на цяжкасць факультэта разбіваюцца адным важкім довадам:—выбраў прафесію—значыцца ішоў на гэта, добра ацаніўшы свае магчымасці.

А дэканат? Ці не яго непасрэдны абавязак весці факультэт на ўзроўні перадавых? І ці не яму трэба кінуць першы папрок за абыякавасць да адстаючых студэнтаў. Выключыць з універсітэта—гэта значыць пайсці па лёгкім шляху пазбаўлення ад дрэнных студэнтаў.

Таварышы Шаліма, Рудзяк, Манько, Чарнаморды, Бабарыка, Далідовіч, ці доўга вы будзеце хадзіць з «хвастамі»? Пару дзён, якія засталіся да сесіі, яшчэ могуць перацягнуць чашу вагі ў вашу карысць. Трата дарагога часу—недаравальная, а іншы раз і непапраўная памылка.

Л. БАРСУКОВА.

# На шляху жыцця і рэалізма

**У апошні год выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна выпусціла ў свет шэраг каштоўных прац па філасофіі, літаратуразнаўстве і педагогіцы. Газета «Беларускі універсітэт» рэцэнзіяй на кнігу прафесара М. Р. Ларчанкі «На шляхах да рэалізма» пачынае серыю рэцэнзій на гэтыя выданні.**

Праца М. Р. Ларчанкі «На шляхах да рэалізма» з'яўляецца першым грунтоўным даследаваннем, прысвечаным вывучэнню пытання аб станаўленні і развіцці рэалізма ў беларускай літаратуры мінулых стагоддзяў. У адпаведнасці з патрабаваннямі тэмы ў кнізе асноўнае месца займаюць літаратурна-мастацкія факты першай паловы XIX стагоддзя, калі прыкметна вызначаюцца тэндэнцыі, якія пазней прыводзяць беларускую дэмакратычную літаратуру на шлях крытычнага рэалізма і сапраўднай народнасці. Такім чынам, аўтар даследуе тыя здабыткі беларускай літаратуры, на аснове якіх у другой палове XIX стагоддзя ў беларускай літаратуры канчаткова замацоўваецца крытычны рэалізм.

Старонкі ўводзін аўтар прысвячае асвятленню асноўных прынцыпаў рэалізма і народнасці. Эстэтычныя прынцыпы Пушкіна, Гогаля, Бялінскага, Чарнышэўскага разглядаюцца ў аспекце значэння іх для развіцця маладой беларускай літаратуры. На аснове ленінскага вучэння аб вызваленчым руху ў Расіі, аб яго розных этапах, аб культуры ў класавым грамадстве аўтар раскрывае нацыянальную самабытнасць беларускай літаратуры, яе вялікае значэнне ў гісторыі вызваленчай барацьбы беларускага народа, у развіцці яго культуры і самасвядомасці.

У першым раздзеле кнігі разглядаюцца тыя элементы рэалізма, якія можна назіраць у старажытнай беларускай літаратуры, а таксама рэалізм беларускага фальклору.

Вусная рэалістычная народная паэзія была заўсёды непарыўна звязана з гістарычным жыццём народа, радзімы. У класавым грамадстве яна заўсёды насіла класавы характар і адлюстроўвала складанасць і супярэчлівасць грамадскага жыцця. Гісторыя народнай творчасці—гэта гісторыя барацьбы ў ёй двух напрамкаў: прагрэсіўнага і рэакцыйнага. Даследуючы прагрэсіўны, рэалістычны напрамак, М. Р. Ларчанка паказвае яго значэнне для развіцця рэалістычнай тэндэнцыі ў беларускай літаратуры.

М. Р. Ларчанка паслядоўна прасачыў развіццё рэалізма ў беларускім фальклоры ў адпаведнасці з нарастаннем класавых супярэчнасцей і вызваленчай барацьбы, з павышэннем самасвядомасці працоўных мас, даў першую ўдалую шырокую навуковую характарыстыку народнай эстэтыкі. Аўтар паказвае, што праца, барацьба і творчасць народа былі непадзельнымі, адзінымі, што змены ў жыцці народа, у рэчаіснасці, праходзячы праз свядомасць працоўных мас, уносілі новае не толькі ў змест твораў, але і ў метад мастацкага адлюстравання жыцця, рэчаіснасці.

Прысвечаная спецыфічнай літаратурнай праблеме, кніга выходзіць далёка за рамкі гэтай праблемы. Здабыткі фальклору, лёс літаратуры разглядаюцца ў цеснай сувязі і непарыўна звязаны з лёсам народа.

Прагрэсіўная і рэалістычная тэндэнцыя становіцца даволі прыкметнай ужо ў беларускай літаратуры XVI—XVIII стагоддзя. Такія творы, як «Прамова Івана Мялешкі», «Ліст да Абуховіча», «Уваскрасенне Хрыстова і сашэсце яго ў пекла» і інш., нясуць у сябе элементы народнасці і рэалізма, элементы мастацкасці, якія абумоўлены пэўнай сувяззю іх аўтараў з жыццём беларускага народа, яго мовай, вуснай народнай творчасцю. Даследаванне літаратуры гэтага перыяду паказвае, што ўзяты напрамак быў вызначаны імкненнем перадавой групы пануючага класа апеляваць да «нізоў» якраз у перыяд абвастрэння барацьбы супраць іншаземнага засілля. Яна мела ў сабе прагрэсіўны пачатак, паколькі імкнулася абараняць чалавечую годнасць, абуджала патрыятызм шырокіх мас. Разам з тым у ёй было яшчэ многа кансерватыўнага і рэакцыйнага, паколькі яна ў значнай ступені адлюстроўвала вузкія інтарэсы пануючых класаў.

Разглядаючы ў другім раздзеле кнігі сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае становішча Беларусі ў першай палове XIX стагоддзя, аўтар указвае на важнейшыя прычыны, якія абумовілі абуджэнне грамадска-палітычнага жыцця, далі пэўны штуршок развіццю беларускай літаратуры. Гэта перш за ўсё ўз'яднанне Беларусі з Расіяй, якое стварыла больш спрыяльныя ўмовы для эканамічнага развіцця Беларусі, вызваліла беларусаў ад насільнай паланізацыі, ажыццявіла спрадвечныя імкненні беларускага народа ўз'яднацца з родным яму па паходжанню, культуры, мове і гістарычным мінулым вялікім рускім народам. Беларускі народ, уз'яднаўшыся са сваім старэйшым братам—вялікім рускім народам—у адзінай дзяржаве, стаў з гэтага часу жыць з ім у аднолькавых сацыяльна-гістарычных, палітычных і культурных умовах. Рэчаіснасць Расіі і Беларусі ставіла ў асноўным аднолькавыя сацыяльныя пытанні. У гэтым аўтар справядліва бачыць першааснову глыбокага ўплыву перадавой рускай літаратуры на літаратурны працэс у Беларусі.

Аб дабратворным уплыве рускай класічнай літаратуры нашымі літаратуразнаўцамі напісана даволі многа. Але ў большасці выпадкаў даследчыкі абмяжоўваліся канстатацыяй фактаў, разглядам вынікаў такога ўплыву. Заканамернасць гэтага ўплыву і шырокая папулярнасць перадавой рускай літаратуры сярод беларусаў, абумоўленыя ў асноўным аднолькавымі сацыяльна-палітычнымі ўмовамі жыцця рускага і беларускага народаў, блізкасцю рэчаіснасці, актуальнасцю і для Беларусі пытанняў, якія ўзнімала руская літаратура, не атрымоўвала неабходнага асвятлення. Кніга М. Р. Ларчанкі, не вычэрпваючы ўсіх бакоў і пытанняў гэтай праблемы, з'яўляецца значным крокам наперад па шляху да яе вырашэння. Аўтар паказвае, што як перадавая руская літаратура XIX стагоддзя неад'емна ад вызваленчага руху ў Расіі, так і грамадскі рух у Беларусі і беларуская літаратура была цесна звязана з ім.

Трэці раздзел кнігі прысвечаны пачатковаму этапу станаўлення новай беларускай літаратуры. Літаратура гэтага перыяду яшчэ ў значнай ступені захоўвала фальклорную форму, распаўсюджвалася ананімна, у рукапісах і была, па сутнасці, вуснай паэзіяй. Традыцыі народнай творчасці займалі ў ёй вядучае месца. Адной з асноўных асаблівасцей беларускай літаратуры першай паловы XIX стагоддзя з'яўляецца тое, што яна стваралася на аснове жыццёвага і творчага вопыту народа, на аснове народнай мовы. Разгляд М. Р. Ларчанкам гэтага пытання—адно з лепшых месц кнігі.

Даследаванне парадыйных паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», якія сцвярджаюць ідэйныя прынцыпы рэалізма і народнасці, паказвае, што ў гэтых па сутнасці першых літаратурных помніках новай беларускай літаратуры, ярка выступае арганічная сувязь з перадавой рускай літаратурай, з пушкінскімі і гогалеўскімі традыцыямі рэалізма і народнасці. Абапіраючыся на мастацкі вопыт Пушкіна і Гогаля, беларуская літаратура з першых сваіх крокаў была непрымірымым праціўнікам ідыялізацыі жыцця, праціўнікам рытарычнай хадульнасці, таннага рамантычнага ўпрыгожвання. Пад уплывам спадчыны Пушкіна, Гогаля, Лермантава беларуская літаратура рабіла першыя спробы спалучыць адлюстраванне сацыяльных з'яў з раскрыццём індывідуальнага лёсу герояў.

Фальклор і літаратура мінулых стагоддзяў маюць адну надзвычай выдатную прыкмету. Яны заўсёды давалі супастаўленне жыцця вярхоў з жыццём простых людзей, народа. Аўтар правільна адзначае, што гэтае супастаўленне падаецца не толькі і не столькі ў плане непасрэднага паказу маральнай прыгожасці народа, колькі ў адлюстраванні народнай працы, народных бедстваў, паразітызма пануючых класаў.

Абапіраючыся на багацейшы фактычны матэрыял, аўтар зрабіў удалую пробу прасачыць і даследаваць працэс узнікнення і крышталізацыі элементаў рэалізма ў старажытнай беларускай літаратуры, развіцці рэалістычных тэндэнцый у літаратуры XVI—XVIII стагоддзяў, важнейшыя крокі ў станаўленні літаратуры першай паловы XIX стагоддзя на шлях сапраўднай народнасці і рэалізма.

Асобны раздзел кнігі аўтар адводзіць для разгляду ролі Дуніна-Марцінкевіча ў станаўленні беларускай літаратуры на шляху да крытычнага рэалізма. М. Р. Ларчанка сабраў, сістэматызаваў, тэарэтычна асэнсаваў і абагуліў ужо вядомы матэрыял па іншых выданнях. Разам з тым ён па-новаму падыходзіць да ацэнкі творчасці Дуніна-Марцінкевіча, паказвае яе значэнне і месца ў гісторыі беларускай літаратуры і ў сувязі з гэтым выказвае цэлы шэраг свежых і каштоўных думак. Аўтар, на нашу думку, зусім слушна абвяргае погляд С. Майхровіча (гл. Беларуская літаратура, падручнік для 8-х класаў сярэдняй школы, 1954 г.) аб тым, што Дунін-Марцінкевіч да 1861 года з'яўляўся прыхільнікам сантыменталізма. Справядліва адзначаючы, што нельга быць прыхільнікам напрамку, якога не было ў той час ні ў беларускай, ні ў рускай літаратуры, М. Р. Ларчанка даводзіць, што хоць рэалізм Дуніна-Марцінкевіча на ўсіх этапах яго творчасці быў абмежаваным і супярэчлівым, яго творы з'явіліся пэўным зрухам наперад ў пашырэнні прынцыпаў крытычнага рэалізма ў беларускай літаратуры. З другога боку, аўтар паказвае сілу і слабасць светапогляду пісьменніка, яго творчага метаду, у якім рэалізм цесна пераплятаецца з элементамі карамзінскага сантыменталізма, прагрэсіўныя, дэмакратычныя ідэі—з рэакцыйнымі поглядамі пісьменніка на прыгонніцкі лад, на памешчыкаў-прыгоннікаў. Выступаючы супраць спрошчанай, аднабаковай ацэнкі творчасці Дуніна-Марцінкевіча, М. Р. Ларчанка разглядае супярэчнасці светапогляду і творчага метаду пісьменніка як адлюстраванне супярэчнасцяў той эпохі. Даследаванне творчасці Дуніна-Марцінкевіча мае каштоўнасць ў тых адносінах, што дае магчымасць, з аднаго боку, усвядоміць своеасаблівасць працэсу станаўлення—вызначыць характар ранняга рэалізма, яго моцныя і слабыя бакі.

Несумненнай заслугай аўтара з'яўляецца тое, што ён імкнецца ахапіць і асвятліць пастаўленую тэму ва ўсёй яе шматграннасці, адзінстве, як шырока разгорнутую эстэтычную праблему. Яшчэ нярэдка і ў наш час праблема рэалізма ў літаратуры мінулых стагоддзяў разглядаецца як дакументальна-дакладнае адлюстраванне нораваў, звычаяў, падзей, гаворак, перш за ўсё, як ступень дакладнасці гісторыка-бытавога апісання. Кніга М. Р. Ларчанкі накіравана супраць такой пастаноўкі пытання. Яна разглядае рэалістычныя тэндэнцыі ў беларускай літаратуры мінулых стагоддзяў не толькі як асобныя рысы праўдзівага і супярэчлівага ў сацыяльным жыцці зараджэнне, фармаванне і станаўленне рэалістычнага напрамку ў літаратуры як складаны, шматгранны і супярэчлівы працэс, які з'яўляецца адлюстраваннем новага, складавага і супярэчлівага ў сацыяльным жыцці народа, у яго барацьбе, у яго свядомасці, у развіцці яго культуры, мовы.

У гэтай вялікай і складанай працы ёсць і свае недахопы. Імкненне даць паглыблены аналіз творчасці Дуніна-Марцінкевіча не заўсёды падмацоўваецца выразнасцю характарыстык, ацэнак, думак. Часам аўтар захапляецца другараднымі пытаннямі і без асаблівай патрэбы адыходзіць ад асноўнай праблемы. Аўтар, на нашу думку, мала увагі ўдзяліў даследаванню першых крокаў тыпізацыі вобразаў. Сустракаюцца непажаданыя паўтарэнні, агульныя месцы, штампаваныя выразы. Не заўсёды захоўваецца спалучэнне навуковай дакладнасці мовы з яе жывасцю і чысцінёй.

Але гэтыя і некаторыя іншыя недахопы не могуць знізіць каштоўнасць працы М. Р. Ларчанкі ў цэлым, якая з пазіцый марксісцка-ленінскай метадалогіі асвятляе асноўную лінію гістарычнага развіцця рэалістычнага напрамку ў беларускай літаратуры.

У заключэнне трэба адзначыць, што кніга добра аформлена. У гэтым заслуга выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, якое, наогул, у апошні час выпусціла ў свет шмат каштоўных і добрааформленых кніг.

А. ПЕТУХ.



**НА ЗДЫМКУ: электразваршчык Сокалаў працуе на будоўлі галоўнага корпуса універсітэта.**

# ГАВОРАЧЫЯ СТАЛЫ

ФЕЛЬЕТОН

ПІСЬМЕННАСЦЬ УЗНІКЛА ў людзей даўно. Мяркуюць, што калі піцекантроп, выбраўшы дрэва мацней, рабіў сваім кіпцюрам першабытны манікюр, а яго сабрат пасля бачыў гэта дрэва, дык разумеў, хто тут быў і што рабіў.

З цягам часу пісьменнасць развівалася, а сродкі яе ўдасканальваліся.

Іракёз пасылаў свайму суседу нізку бус—вампум, чырвонага колеру, і той разумеў, што з гэтага часу трэба берагчы свой скальп.

Вавілонскі цар Хамурапі выціскаў значкі залатой палачкай на гліне. Падпраўляў уласным пазногцем.

Потым пісалі на папірусе, потым—на пергаменце. Наўгародзец Гасцята напісаў пісьмо свайму сябру Васілію на кары бярозы.

Кітаец Чай Лунь выпайшаў паперу. Пісалі на паперы.

Пісалі каламам — трасніковай палачкай, пісалі гусінымі, лебядзінымі, бекасавымі пёрамі. З 18 веку ў Мюнхене пачалі пісаць сталёвымі.

Апошняе слова тэхнікі—кітайская аўтаручка і звычайны стол.

У стала шмат пераваг перад паперай. Ён не камячыцца і не рвецца, як папера; думкі, выказаныя на ім, жывуць значна даўжэй. Тое, што напісана на стале пяром, сапраўды трэба высякаць сякерай.

...Вокны аўдыторыі шырока расчынены, але подыхі слабенькага ветрыка прыносяць мала прахлады. У аўдыторыі такое ж ціхае паветра, як і на вуліцы: вясна ёсць вясна...

Адольвае млявасць, нейкая санлівасць. Голас выкладчыка даносіцца аднекуль здалёк. Студэнт сядзіць нерухома, падпёршы галаву рукою, думае пра нешта сваё. Другая яго рука вычэрчвае пяром на стале спачатку квадрат, потым робіць з яго куб, пасля паяўляюцца вакол усяго гэтага нейкія хітрыя завітушкі, чымсьці далёкім напамінаючыя ні то ўсходне-азіяцкі арнамент, ні то малюнак з часопісу «Польша».

Вось актавая зала корпуса, дзе займаюцца гісторыкі, юрысты, філолагі—людзі, сярод якіх ёсць нямала талентаў.

На адным століку партрэт прыгожай дзяўчыны. Побач—вядро і чаравік. Цяжка сказаць—якая ідэя гэтага сімвалістычнага «твору»? Ці не агітацыя за самаабслугоўванне ў інтэрнатах?

А наступны стол прысвечаны каханню. Колькі тут пяшчотных, хвалюючых слоў!..

«Дзе б ты не быў—усёроўна цябе знайду», «Нікому не паверу, што другую кахаеш ты»... «Ты ўвайшоў у жыццё маё няпрошаным»,—выліваюць на стале свае пачуцці дзяўчаты. Не могуць устрымацца і хлопцы: «Я кахаю цябе, мая кошачка, без цябе не магу дня пражыць». Чыясьці мужчынская суровая душа была абражана гэткай слабасцю і тут жа на століку, заключыла: «Другіх глупстваў прыдумаць нельга...»

Міжволі ў глыбокім хваляванні спыніліся мы ля наступнага стала.

Хацелі шапкі зняць, але іх не было ў нас. Ды і як не хвалявацца, калі магчыма глядзім мы на яе вялікасць Гісторыю. Год праз некалькі можа будзе стаяць гэты столік у музеі, як дарагі экспанат. Ён жа непасрэдна звязаны з Леапідам Фадзеевым з філфака, маладым хутка растучым празаікам. Цэлых сем разоў напісана на століку яго імя і прозвішча. Пройдуць гады, многае зменіцца, але заўсёды, хто не сядзе за гэты столік, з хваляваннем прачытае аўтограф нашага Фадзеева.

А на другім століку зноў аўтографы: «Паўловіч, 3 курс, рускае аддзяленне, Саркісян Валя» і многа другіх.

Галя Вітумка?! Хто ты і адкуль? Не здзіўляйся, што мы ведаем тваё імя і прозвішча. Мы іх прачыталі на стале ў 38 аўдыторыі. Шкада толькі, Галя, што ты больш нічога не паведаміла аб сабе, на якім курсе вучышся, дзе жывеш. І засталася ты «дзяўчынай без адрасу...» Зрабі ласку, Галя, калі будзеш сядзець у наступны раз за гэтым сталом—папоўні звесткі.

Другі стол гэтай жа аўдыторыі стаў сродкам перапіскі. Спачатку: «Ларыса, чаму ты пайшла?..» Потым: «Не хацела цябе бачыць...»

Да гэтага часу мы не ўстанавілі, хто такі таварыш Бабурын: студэнт ці поп. Па маючыхся ў нас звестках,—студэнт. Але вось у 58 аўдыторыі хімічнага корпуса на адным са сталоў намаляваны чалавек у папоўскай расе і побач подпіс: «Бабурын—духоўны бацюшка...» Таварыш Бабурын! Хто ж вы на самай справе? Можа растлумачыце? А можа знойдзеце аўтара вашага партрэта і «папросіце» яго растлумачыць.

А чаго толькі няма на другіх сталах гэтай аўдыторыі! Вось на адным: партрэты дзяўчат, дамы, кветкі, бакалы. А побач арыфметычныя разлікі. Магчыма, бакалы і разлікі звязаны... Відаць, аўтар падлічваў, колькі грошай засталося ў яго ад стыпендыі...

Не падумайце, што нікога не хвалюе лёс сталоў. Знайшлася і сярод студэнтаў чулая душа. Знайшлася і звярнулася да другіх з заклікам: «Хлопцы, ну навошта чыркаеце на сталах». А каб заклік быў мацнейшым тоўстымі літарамі вычарціла яго... на стале!

У сярэдніх вяках, калі пісцу не хапала пергаменту, ён браў стары, старанна выскоблівіў тэкст, адбельваў скуру ў растворы хлорнай вапны і зноў пісаў. Вось бы прымусіць некаторых аматараў настольнага жывапісу выканаць першую палавіну гэтага тэхналагічнага працэсу. Другую можна замяніць афарбоўкай стала за ўласны кошт.

**М. Шыманскі, І. Патапаў.**

# У СЯБРОЎ БАЯВЫХ

ДАЎНЯЯ ДРУЖБА звязвае фізікаў і матэматыкаў з воінамі Н-скай часці. Ужо не раз яны прыязджалі адзін да аднаго ў госці. Вось і ў нядзелю, 17 мая, была намечана чарговая паездка да воінаў-сяброў. Нядаўнія сапернікі ў спартакіядзе БДУ, фізікі і матэматыкі цяпер аб'ядналіся супроць агульнага «ворага». У 10 гадзін раніцы тры машыны, перапоўненыя спартсменамі, удзельнікамі мастацкай самадзейнасці і энтузіястамі-балельшчыкамі, рушылі ў паўтарагадзінны «прабег».

І вось спаборніцтвы пачынаюцца—на зялёнае поле выбягаюць футбалісты. Футбол мы лічылі самым слабым сваім месцам: у арміі ж—гэта самы пашыраны від спорту. Усе там пастаянна трэніруюцца, а ў нашай камандзе больш палавіны ігракоў «не трымалі мяча ў нагах» па два—тры гады.

На наша здзіўленне, хлопцы гуляюць даволі тэхнічна, абаронцы выдатна спраўляюцца са сваімі абавязкамі—ды як жа інакш: там гуляюць «прафесіяналы» Корнеў і Сокалаў. Нават варатар Сёма Розін, за якога мы больш усяго баяліся, упэўнена абараняе вароты. На пятнаццатай мінуце Корзун выдатна абходзіць абаронцаў, і вядзём лік мы! Гаспадары стараюцца адыграцца, але беспаспяхова. І толькі на апошняй мінуце першага тайма, калі нашы неяк «размагніціліся», хтосьці з абаронцаў злавіў мяч рукамі. Адзінаццацімятровы! Удар—і лік 1:1.

У другім тайме адбылася даволі рэдкая ў вялікім футболе з'ява: варатар Розін пайшоў на правы край, а былая «сямёрка» майстар спорту—праўда, па шашках,—Гелер узяў шапку і рукавіцы і стаў варатаром. Вядома, у футбол Гелер гуляе крыху горш, чым у шашкі, але быў час, калі ён аддаваў перавагу першаму, так што тэхніка ў ветэрана засталася. Некалькі разоў ён перахопліваў перадачы, ліквідаваў вострыя прарывы і вёў сябе як сапраўдны «сухі» варатар. Але... у сярэдзіне тайма няўмольны суддзя Велеська, які жадаў вызначыцца аб'ектыўнасцю, назначае ў нашы вароты другі адзінаццацімятровы. Нападаючы разбягаецца, мы закрываем вочы—а калі адкрываем, то бачым, што Гелер ляжыць на зямлі і трымае мяч. Потым ён казаў, што гэта было не цяжэй, чым перасунуць шашку. Удар быў проста ў грудзі. Але другі мог бы паваліцца са страху. Гелер не такі. Ён мужна прыняў мяч, потым, праўда, выпусціў яго, аднак дагнаў, кінуўся на яго і абняў так пяшчотна, што некаторыя нават пазайздросцілі... мячу. У выніку—ганаровая нічыя.

Горшыя справы былі ў валейбалістаў. Тут не прыехалі Гусакоў, Відмант, Курлакоў. І нягледзячы на адчайныя намаганні ігракоў і суддзі—бо суддзя быў наш—сустрэча была праіграна з лікам 2:3. Не вызначыліся і нашы спрынтары: у эстафеце 4х100 ужо на другім этапе гаспадары вырваліся наперад: эстафета была праіграна.

Заставалася адна надзея на баскетбалістаў, але яны расстроілі нас больш за ўсіх. Каманда іграла, як навічкі, кожны стараўся дзейнічаць сам за сябе. Была і аб'ектыўная прычына: вельмі высокія кольцы, да якіх мы не прывыклі. Акрамя таго, судзейства было вельмі некваліфікаванае, гульня насіла крыху рэзкі характар. Але галоўнае, у камандзе не было арганізатара, якім мог бы стаць, калі б ён паехаў, У. Крысевіч.

Цікава прайшоў матч па шашках. Праўда, за нашу каманду не іграў Гелер, але ён вырасціў дастойную змену.

Лепш за другіх згуляла Л. Лесіна. Праўда, у часці не было добрай шашысткі, так што Лілі давялося гуляць з вусатым дзядзькам, які ёй здаўся, відавочна, з-за ветлівасці. Агульны лік 5:2 у нашу карысць.

Нажаль, гаспадары не выставілі каманд у эстафеце 100х200х400х х800, а таксама па кулявой стральбе і барацьбе.

Сустрэча прайшла ў добрай, таварыскай абстаноўцы. Было вырашана не траціць сувязі і працягваць сустрэчы, якія сталі ўжо традыцыйнымі.

**Я. ГЕНДЭЛЬ,**
студэнт 4 курса матфака.

НА КОНКУРС



На возеры Нарач. Фотаэцюд А. ЛУКАШОВА.

## Фізкультура і спорт

# Круглагадавая спартакіяда закончылася

ГЭТЫМІ ДНЯМІ закончылася 7-ая круглагадавая спартакіяда універсітэта. Яна ставіла сваёй мэтай уцягнуць шырокія масы студэнцтва ў пастаянныя арганізаваныя формы вучэбна-спартыўнай работы, павысіць іх спартыўнае майстэрства, а таксама выявіць лепшых спартсменаў для ўкамплектавання зборных каманд універсітэта.

Спартакіяда праводзілася амаль на працягу ўсяго вучэбнага года. У праграму спартакіяды былі ўключаны наступныя віды спорту абавязковыя для ўсіх факультетаў: лёгкая атлетыка ў зімовых і летніх умовах, вясновы крос, плаванне, гімнастыка, веласпорт, валейбол і баскетбол, і дадатковыя: шахматы, шашкі, акрабатыка, фехтаванне, падняцце цяжараў, класічная барацьба і мастацкая гімнастыка.

Правядзенне спартакіяды па асноўных і дадатковых відах спорту дало магчымасць, асабліва факультэтам з невялікай колькасцю студэнтаў, найбольш актыўна прыняць удзел у спаборніцтвах.

Акрамя гэтага, у палажэнні па правядзенню спартакіяды было прадугледжана тое, што кожны студэнт-спартсмен мае права ўдзельнічаць не больш чым па двух відах спорту. Гэтая акалічнасць заставіла камсамольскі і фізкультурны актыў, а таксама выкладчыкаў кафедры фізвыхавання і спорту, адказных за факультэты, прыцягнуць да трэніровак шэраг студэнтаў, асабліва са старэйшых курсаў.

У выніку сёлета колькасць студэнтаў, якія ўдзельнічаюць у спартакіядзе, значна павялічылася. Калі ў мінулым годзе ў круглагадавой спартакіядзе ўдзельнічала 1874 студэнты, то ў гэтым годзе—2444 студэнты, гэта значыць, амаль на 600 чалавек больш.

Добра выступілі каманды матэматычнага, фізічнага, хімічнага і гістарычнага факультэтаў. Яны ў асноўным вялі барацьбу за прызавыя месцы спартакіяды. У выніку напружанай барацьбы агульнае 1-ае месца заваяваў калектыў спартсменаў матэматычнага факультэта.

Добра выступілі баскетбольныя каманды матэматычнага і фізічнага факультэтаў, каманды па лёгкай атлетыцы ў зімовых умовах гістфака, каманды па класічнай барацьбе і штанзе юрыдычнага факультэта.

Дрэнную спартыўную падрыхтоўку прадэманстравалі каманды філалагічнага і біялагічнага факультэтаў.

**ВЫНІКІ СПАРТАКІЯДЫ**

| Факультэты | ачкі | месца |
|---|---|---|
| Матфак | 45,5 | 1 |
| Фізфак | 52.0 | 2 |
| Гістфак | 53,5 | 3—4 |
| Хімфак | 53,5 | 3—4 |
| Геафак | 72,0 | 5 |
| Юрфак | 88,0 | 6 |
| Філфак | 110,0 | 7 |
| Біяфак | 114,0 | 8 |

У будучым годзе для больш шырокага ўцягнення студэнтаў у спартыўную работу кафедра фізвыхавання і спартклуб універсітэта будуць праводзіць спартакіяду ў 2 этапы: у першым этапе, які будзе праводзіцца ў першым паўгоддзі, прадугледжаны абавязковыя спаборніцтвы ўнутры факультэтаў па пяці відах спорту (лёгкая атлетыка, асенні крос, стральба, шахматы, лыжны спорт), а ў другім паўгоддзі — спаборніцтвы паміж факультэтамі па праграме спартакіяды. У яе будуць уключаны канькабежны спорт, ручны мяч 7 Х 7 і футбол.

Першы этап спартакіяды ўваходзіць у залік факультэтам пры падвядзенні вынікаў II этапа з каэфіцыентам «3», т. ч. факультэты, якія не звернуць належнай увагі на добрую арганізацыю спаборніцтваў на I этапе, не змогуць разлічваць на добрыя вынікі ў круглагадавой спартакіядзе.

**М. БАНДАРЭНКА.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ
АТ 03174 Зак. 800 Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.